# ВЫКАРЫСТАННЕ ІНФАРМАЦЫЙНА-АДУКАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ І ЭЛЕКТРОННЫХ АДУКАЦЫЙНЫХ СРОДКАЎ У АДУКАЦЫЙНЫМ ПРАЦЭСЕ.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ
## ПА РАБОЦЕ З ЭЛЕКТРОННЫМ АДУКАЦЫЙНЫМ РЭСУРСАМ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ
## "ЛІТАРАТУРНЫЯ ВІРАЖЫ"
## ДЛЯ ВУЧНЯЎ 5 КЛАСАЎ

Аўтар:
В.У. Кот
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
"Гімназія №1 г. Жлобіна",
настаўнік беларускай мовы і літаратуры,
вышэйшая катэгорыя

Артыкул

Сёння працу настаўніка на ўроках беларускай мовы і літаратуры зараз складана ўявіць без выкарыстання электроннага адукацыйнага рэсурса. Дзякуючы ім беларускае слова набывае шмат дадатковых адценняў у яго ўспрымманні і асэнсаванні, напрыклад: разглядаецца на экране ці маніторы камп’ютара і запамінаецца ў  колерным абрамленні, хутчэй падаецца інтэрактыўнаму асваенню і аналізу ў кантэксце , якi можна без асаблівых намаганняў аднавіць.

Электронны адукацыйны рэсурс “Літаратурныя віражы” прызначаны для вучняў 5 класаў. “Літаратурныя віражы” распрацаваны ў адпаведнасці з заснаванай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь вучэбнай праграмай па прадмету “Беларуская літаратура”.

Рэсурс разлічан на шырокі круг карыстальнікаў: для вучняў і настаўнікаў.

**Перавагі электроннага адукацыйнага рэсурса “Літаратурныя віражы”:**

- размеркаванне вучэбнага матэрыялу па тэмам;
- разнастайнасць форм інфармацыі( тэкст, відэа- і аўдыяматэрыялы);
- магчымасць пошуку неабходнага матэрыялу;
- магчымасць самааналіза вынікаў;
- забеспячэння гатоўнасці вучняў да самастойнай працы.
- Матэрыял рэсурса сістэматызаваны ад простага да складанага.

Змест, структура і форма дапаможніка дазваляюць настаўніку выкарыстоўваць заданні варыятыўна на ўсіх этапах урока, ужываючы калектыўную, групавую, індывідуальную формы работы з вучнямі.

**Змест і структура электроннага адукацыйнага рэсурса “Літаратурныя віражы”.**

Сучаснае грамадства прадстаўляе да чалавека ўсё больш высокія патрабаванні. Ва ўмовах росту сцыяльнай канкурэнцыі маладому чалавеку неабходна ўмець творча прымяняць тыя веды, уменні,навыкі, якімі ён валодае,умець дзейнічаць эфектыўна. Для таго, каб быць запатрабаваным грамадствам, неабходна быць крэатыўным, незаменным. А для гэтага трэба, каб дзейнасць насіла творчы характар.Грамадству неабходны людзі, якія валодаюць словам, умеюць абараніць свае перакананні,погляды, творча ўключыцца ў працэс міжасобнай камунікацыі.Праблема развіцця маўлення вучняў набывае ў наш час усё большае грамадскае значэнне, таму што маўленне з’яўляецца важным паказчыкам духоўнай культуры асобы. Не выклікаць цікавасці ў сучаснага вучня гатовыя веды, простыя пытанні, прабемы, якія не вымагаюць даследавання, удумлівага асэнсавання.Вучню ў першую чаргу павінна быць цікава на ўроках [ 1, с. 35].

**Мэтай электроннага адукацыйнага рэсурса з’яўляецца**

- развіццё творчых здольнасцей вучняў на ўроках беларускай літаратуры.

**Задачы:**

- стварэнне інтэрактыўных заданняў да падручніка беларуская літаратура 5-га класа;
- павышэнне эфектыўнасці ўрокаў беларускай літаратуры, праз выкарыстанне электроннага адукацыйнага рэсурса;
- выхаванне павышэнне матывацыі да роднай мовы.

**Актуальнасць:**

Распрацаваны электронны адукацыйны рэсурс прызначаны для камп'ютарнай падтрымкі правядзення ўрокаў беларускай літаратуры і для самастойнай падрыхтоўцы вучняў.Праэкт распрацаваны з улікам патрабаванняў школьнай праграмы. Розныя формы заданняў прыводзяць да разнастайнасці агульнаадукацыйнага працэсу і павышэнню цікавасці вучняў да роднай мовы і літаратуры. ЭАР "Літаратурныя віражы" распрацаваны з улікам магчымасці зручнай работы з інтэрактыўнай дошкай. Інтэрфэйс усіх функцыянальных блокаў мае такія элементы кіравання, якія дазваляюць зручна працаваць як на камп'ютарах і планшэтах, так і на інтэрактыўнай дошцы[ 2, с. 95].

Большасць форм заданняў забяспечана аўтаматычным ацэньваннем. Вядзецца запіс усіх дзеянняў вучня падчас работы з праграмным комплексам, такім чынам ацэньванне магчыма пасля заканчэння заняткаў шляхам прагляда ўсіх заданняў, выкананых вучнем.

Выкарыстанне гэтага адукацыйнага рэсурса дапамагае выхаванню чытача, які здольны да ўласнай думкі; спрыяе ўключэнню вучняў у самастойную літаратурна-творчую дзейнасць; садзейнічае ўдасканаленню формаў і метадаў навучання літаратуры.

У дапаможніку "Літаратурныя віражы" даюцца творчыя заданні да кожнага з блок-раздзелаў вучэбнага падручніка па беларускай літаратуры для 5 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

У блок-раздзеле " Вусная народная творчасць", прапаноўваюцца заданні, якія накіраваны на кантроль і праверку вынікаў вучэбнай дзейнасці, колькі на фарміраванне саміх спосабаў камунікатыўна-творчай дзейнасці,на развіццё вобразнага мыслення падлеткаў[ 3, с. 95].

У блок-раздзеле "Прырода вечная краса" , "Мой чароўны беларускі край", "Сцежкамі дзяцінства" вучні выхоўваюць назіральнасць і чуйнасць да слова,спрыяюць развіццю эўрыстычных здольнасцей. Выканання такіх заданняў можна меркаваць пра ступень сфарміраванасці творчых уменняў вучняў і кіравацца гэтым ў далейшай дзейнасці. Акрамя таго, ажыццяўляецца запамінанне пры "навучанні з захапленнем" [ 4, с. 47].

Змешчаныя заданні могуць быць выкарыстаны настаўнікам для ажыццяўлення розных відаў кантролю і ацэнкі якасці засваення вучнямі-чытачамі асноўнага вучэбнага матэрыялу.

**Тэхнічныя патрабаванні**

-ОС  Windows(і вышэй)

- манітор з дазволам 800 х 600(і вышэй)
- усталяваны Adobe Flash Player
- выхад ў інтэрнэт

Аўтар – складальнік лічыць, што гэты электронны адукацыйны рэсурс стане добрым дадаткам да вучэбнага дапаможніка па беларускай літаратуры для 5 класаў аўтара  Цітова Л.К., садзейнічае падтрыманню ўстойлівай цікавасці да беларускай літаратуры. Гэты рэсурс можа быць выкарыстаны,  як самастойна, так і з другімі сродкамі навучання.

**Мінімальныя патрабаванні да абсталявання:**

Версія Windows 7, XP ці 8
Праграма iSpring Suite 8
Macromedia Flash Player 10
Выхад у сетку інтэрнэт
Learningapps.com
Adobe Flash Player 28 PPAPI

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1.Цітава Л.К. Беларуская літаратура : вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання: у 2 частках. / Л.К.Цітова. – 2-е выданне,перапрацаванае і дапоўненае. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – Ч. 1. – С. 160

2. Цітава Л.К. Беларуская літаратура : вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання: у 2 частках. / Л.К.Цітова. – 2-е выданне,перапрацаванае і дапоўненае. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – Ч. 2. – С. 176

3. Праграма iSpring Suite 8

4. Праграма Learningapps.com

Приложение

https://drive.google.com/file/d/1RjajJ2p1__UKjv47b8KsXHYbNg79WoJY/view?usp=sharing